УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_______________ А.В.Макоўчык
«21» 06 2023 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-1-47/2023/уч.

# АКТУАЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура**

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені АСВА 1-02 03 01-2022, (20.04.2022, № 85), вучэбнага плана спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

І.М.Мішчанчук, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

М.С.Рак, выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

А.У.Сузько, дацэнт кафедры беларускай і рускай філалогіі ўстановы адукацыі «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П.Шамякіна», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

Н.У.Чайка, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», прафесар

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар
ДУА «Гімназія № 43 г. Мінска» ____________ М.Ф.Кавалеўская

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 ад 21 сакавіка 2023 г.)

Загадчык кафедры ____________ І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 6 ад 21.06 2023 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ ____________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне «Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры» распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура.

***Мэты*** вывучэння дысцыпліны «Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры» – засваенне і паглыбленне магістрантамі тэарэтычных асноў выкладання нацыянальнай літаратуры ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь, фарміраванне ў іх сістэмы ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для вядзення актыўнай, самастойнай практычнай дзейнасці па спецыяльнасці, для ўсвядомленага выбару эфектыўных метадаў, прыёмаў і форм выкладання слоўнага мастацтва, пошуку новых тэхналогій, ажыццяўлення актуалій, звязаных з арганізацыяй урока, аналізам мастацкіх твораў розных жанраў, этапамі вывучэння літаратурнага твора, выпрацоўка ў будучых спецыялістаў неабходных практычных навыкаў выкладання прадмета.

***Задачы*** вывучэння дысцыпліны:

- раскрыць дыдактычныя і метадалагічныя асновы і палажэнні курса;
- дапамагчы авалодаць прафесійнымі навыкамі свядомага шматузроўневага аналізу літаратурных фактаў і з’яў;
- выпрацаваць навыкі самастойнага разумення прынцыпаў, метадаў і прыёмаў выкладання літаратуры з улікам яе гнасеалагічнай і аксіялагічнай спецыфікі;
- дасягнуць умення спалучаць тэарэтычна і на практыцы псіхолага-педагагічныя і філалагічныя веды, набытыя пры вывучэнні спецыяльных дысцыплін;
- узброіць валоданнем задач сучаснай літаратурнай адукацыі, зацікавіць іх дыскусійнымі пытаннямі выкладання літаратуры, падрыхтаваць да самастойнай, творчай інтэрпрэтацыі нявырашаных у педагагічнай і метадычнай навуцы праблем.

Праграма дысцыпліны «Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры» распрацавана з улікам наступных тэарэтычных і метадычных палажэнняў: варыятыўнасць у навучанні, якая дае выкладчыкам права выбару паслядоўнасці вывучэння тэм, вылучаць і больш шырока тлумачыць тыя або іншыя тэмы дысцыпліны пры захаванні яе змястоўнай цэласнасці і канцэптуальнасці; дыферэнцыраваны падыход да ацэнкі магчымасцей і ведаў магістрантаў у працэсе вывучэння курса; стварэнне спрыяльных умоў для самастойнай працы, выпрацоўкі навыкаў самакантролю, развіцця творчых здольнасцей; выкарыстанне міжпрадметных сувязей.

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дадзенай дысцыпліны пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы).

***Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкаі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі***. Згодна з вучэбным планам па спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура вучэбная дысцыпліна «Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры» ўваходзіць у дзяржаўны кампанент і з’яўляецца адной з асноўных дысцыплін падрыхтоўкі настаўніка-філолага.

Вучэбная дысцыпліна «Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры» звязана з вучэбнымі дысцыплінамі «Методыка выкладання беларускай літаратуры», «Асновы псіхалогіі і педагогікі», «Педагогіка», якія ўваходзяць у дзяржаўны кампанент для спецыяльнасцях 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура, 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы), «Актуальныя аспекты методык выкладання спецыяльных дысцыплін», якая ўваходзіць у кампанент установы вышэйшай адукацыі для спецыяльнасцях 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы).

***Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура вучэбнай кампетэнцыі УК-6: Здзяйсняць прафесійную дзейнасць ва ўмовах абнаўлення яе мэт, зместу, змены тэхналогій, вызначаць метады рашэння прафесійных задач, ацэньваць іх эфектыўнасць і якасць; базавай прафесійнай кампетэнцыі БПК-1: Праектаваць працэс навучання, ставіць адукацыйныя мэты, адбіраць змест вучэбнага матэрыялу, метады і тэхналогіі на аснове сістэмы ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці; базавай прафесійнай кампетэнцыі БПК-5: Здзяйсняць адбор зместу форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання, прымяняць іх у адукацыйным працэсе з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***ведаць:***

– метадалагічныя асновы дысцыпліны;

– структуру, змест і прынцыпы арганізацыі школьнай адукацыі па беларускай літаратуры на сучасным этапе;

– актуальныя праблемы і сучасныя тэндэнцыі развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***умець:***

– прымяняць атрыманыя веды пры вырашэнні педагагічных, вучэбна-выхаваўчых і навукова-метадычных задач з улікам узроставых і індывідуальных адрозненняў вучняў, сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцей вучнёўскіх калектываў і канкрэтных педагагічных сітуацый;

– выкарыстоўваць разнастайныя метады і прыёмы навучання ў працэсе спасціжэння літаратурнага матэрыялу, ажыццяўляць кіраўніцтва мастацка-творчай і даследчай дзейнасцю вучняў;

– аналізаваць і абагульняць перадавы педагагічны вопыт, сістэматычна павышаць сваю прафесійную кваліфікацыю.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***валодаць:***

– адпаведным паняційным і метадычным апаратам;

– уменнямі аналітычна апрацоўваць метадычны матэрыял, выяўляць яго выхаваўчы і псіхолага-педагагічны патэнцыял.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой

каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

***Асноўнымі тэхналогіямі навучання з'яўляюцца:*** праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна арыентаваная тэхналогія, інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі (мультымедыйныя прэзентацыі, online-тэсты, інтэрактыўныя заданні ў сістэмах дыстанцыйнага навучання і інш.).

***Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў.*** Пры вывучэнні дысцыпліны «Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры» выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай работы, як выкананне індывідуальных заданняў на практычных занятках пад кантролем выкладчыка, выкананне індывідуальных заданняў пазааўдыторна, інтэрактыўных заданняў у сістэмах дыстанцыйнага навучання, запіс элементаў урокаў па літаратуры і інш.

***Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, формы прамежкавай атэстацыі.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры» на 3 курсе разлічана на 100 вучэбных гадзін. З іх 48 аўдыторныя гадзіны: 24 лекцыйных, 24 практычных, 52 гадзіны адведзена на самастойную работу студэнтаў. Форма адукацыі – дзённая. Форма кантролю – экзамен.

Размеркаванне гадзін па семестрах:

| **Семестр** | **Усяго** | **Лекцыі** | **Практычныя** | **Самастойная работа студэнтаў** | **Форма кантролю** |
|---|---|---|---|---|---|
| V | 100 | 24 | 24 | 52 | Экзамен |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Уводзіны

Тэарэтычныя асновы курса. «Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры» як дысцыпліна педагагічнага профілю, яе сувязь з іншымі навуковымі дысцыплінамі. Прадмет, змест і структура курса. Асноўныя пытанні курса. Гнасеалагічныя і аксіялагічныя асновы навучання літаратуры і яе метадалогіі.

Асноўныя падыходы да навучання літаратуры: антрапалагічны, дзейсны, сістэмны, культуралагічны, асобасна арыентаваны і інш.

Значэнне практыкі школьнага выкладання для развіцця метадалогіі методыкі. Асноўныя метады даследавання ў галіне методыкі выкладання літаратуры.

## Тэма 2. Кампетэнтнасны падыход пры вывучэнні літаратуры

Культуралагічная адукацыйная прастора, яе змест і структура.

Культуралагічны патэнцыял адукацыйнага прадмета «Беларуская літаратура». Літаратура як сацыякультурны феномен. Беларуская літаратура як сродак далучэння вучняў да духоўнага жыцця і культуры народа, эстэтычнага асваення свету.

Фарміраванне культуралагічнай кампетэнцыі вучняў сродкамі мастацкай літаратуры. Духоўна-маральная культура вучняў і яе фарміраванне на ўроку. Фарміраванне грамадзянскай культуры вучняў у працэсе аналізу праграмных твораў па літаратуры. Камунікатыўная культура і методыка яе развіцця на ўроках літаратуры. Фарміраванне і развіццё эстэтычнай культуры як важны кампанент навучання беларускаму мастацтву слова. Экалагічная культура і методыка яе фарміравання на ўроку літаратуры на II і III ступенях літаратурнай адукацыі.

Міжпрадметныя сувязі як сродак дыялогу літаратуры з іншымі відамі мастацтва (жывапіс, музыка, фотамастацтва, кіно, тэатр і інш.), іх месца і роля ў маральна-этычным, інтэлектуальным, эмацыянальным, эстэтычным развіцці асобы.

## Тэма 3. Фарміраванне функцыянальнай граматнасці на ўроку літаратуры

Спецыфіка кампетэнтнаснага падыходу ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Пераасэнсаванне працэсу падрыхтоўкі вучняў. Кампетэнтнасная мадэль падрыхтоўкі як выпрацоўка сістэмы кампетэнцый, неабходных для далейшай прафесійнай дзейнасці.

Структура кампетэнцый як цэласнасць мэтава-каштоўнаснага, кагнітыўна-заместавага, дзейнаснага і рэфлексійнага кампанентаў. Склад кампетэнцый: веды, спосабы дзейнасці, вопыт творчай дзейнасці, вопыт каштоўнасных адносін да аб’ектаў рэчаіснасці.

Спецыяльныя (прадметныя) кампетэнцыі па беларускай літаратуры як аснова для фарміравання асноўных відаў функцыянальнай граматнасці – маўленчай, камунікатыўнай, культуралагічнай і чытацкай.

Чытацкая граматнасць як важнейшая разнавіднасць функцыянальнай граматнасці і спектр яе кампетэнцый – ад базіснага дэкадзіравання, ведання слоў да ведаў пра свет. Актыўны, мэтанакіраваны і канструктыўны характар выкарыстання чытання ў розных сітуацыях і з рознымі мэтамі.

## Тэма 4. Стан методыкі выкладання беларускай літаратуры на сучасным этапе развіцця адукацыі

Метадычная думка ў 2000–2020-я гады. Удасканаленне зместу і структуры літаратурнай адукацыі, перапрацоўка праграм па літаратуры на аснове асобасна арыентаванага падыходу.

Актывізацыя метадычнай думкі ў першай трэці XXI стагоддзя. Удасканаленне вывучэння мастацкага твора з улікам яго жанравай спецыфікі, разнастайных шляхоў аналізу. Пошукі новых метадаў і прыёмаў навучання слоўнаму мастацтву. Сучасны стан методыкі выкладання беларускай літаратуры: абнаўленне метадалогіі, пошук адметных тэхналогій, выкарыстанне вопыту замежнай школы.

Роля часопісаў «Роднае слова», «Беларуская мова і літаратура, «Веснік адукацыі» і інш. у актывізацыі беларускай метадычнай думкі.

Змест і структура «Вучэбнай праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. V—XI класы». Новыя дапаможнікі па беларускай літаратуры, іх тыпы і структура.

## Тэма 5. Прынцыпы, метады і прыёмы выкладання літаратуры ў сучаснай адукацыйнай прасторы

Трансфармацыя прынцыпаў, метадаў і прыёмаў выкладання літаратуры на сучасным этапе. Прынцыпы антрапалізацыі адукацыі, педагагічнай кангеніяльнасці і свабоды ў развіцці асобы, успрымання вучэбнага прадмета з пазіцый асобасных патрэб, развіццёвага навучання.

Найбольш эфектыўныя метады і прыёмы вывучэння літаратуры ў сучаснай адукацыйнай прасторы, іх адметнасць і спецыфіка.

## Тэма 6. Высокатэхналагічнае адукацыйнае асяроддзе ў літаратурным навучанні. Методыка прымянення інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў на ўроках літаратуры

Высокатэхналагічнае адукацыйнае асяроддзе: склад, структура, спецыфіка функцыянавання на сучасным этапе развіцця літаратурнай адукацыі.

Функцыянальныя магчымасці высокатэхналагічнага адукацыйнага асяроддзя для развіцця чытацкіх, камунікатыўных, літаратурна-творчых і даследчых уменняў і навыкаў вучняў. Перспектывы развіцця высокатэхналагічнага адукацыйнага асяроддзя.

Каталог інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для V – XI класаў.

Нацыянальныя адукацыйныя інтэрнэт-парталы, методыка іх выкарыстання пры правядзенні ўрокаў па беларускай літаратуры.

Методыка прымянення ЭСН «Беларуская літаратура. Сусвет роднага слова» і інфармацыйнага выдання «Паэт красы і гармоніі: да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча (1891 – 1917)» на ўроках літаратуры ў V – IX класах.

Выкарыстанне магчымасцей віртуальных музеяў і сайтаў, прысвечаных беларускім пісьменнікам, на ўроках літаратуры.

Прымяненне на ўроку і ў пазаўрочнай дзейнасці электронных хрэстаматый, гукавых электронных выданняў, мастацкіх электронных выданняў, аўдыякніг («Беларуская і руская літаратура. У дапамогу навучэнцам», «Колас Я. Новая зямля (паэма). На ростанях (трылогія)», «Творы па беларускай літаратуры для завучвання на памяць: паэмы, вершы, проза, песні», «Беларускія народныя казкі», «Гарэцкі М. Дзве душы» і інш.).

Прымяненне электронных выданняў як сродкаў рэалізацыі міжпрадметных сувязей пры вывучэнні беларускай літаратуры (ЭВ «Мастацтва ў школе: жывапіс, скульптура» і інш.).

## Тэма 7. Інфармармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі на ўроку літаратуры

Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі як сукупнасць метадаў, працэсаў і праграмна-тэхнічных сродкаў, інтэграваных з мэтай збору, апрацоўкі, захавання, распаўсюджвання, адлюстравання і выкарыстання інфармацыі. Асноўныя сродкі ІКТ, якія атрымалі распаўсюджванне ў сучаснай сістэме адукацыі: персанальны камп’ютар, тэлекамунікацыі, мультымедыя, мабільныя прылады.

Прэзентацыі (Microsoft PowerPoint), online-дошкі (Padlet, Miro, Lucidspark і інш.), інтэрнэт-заняткі з дапамогай парталаў, вядзенне акаўнтаў у сацыяльных сетках (Twitter, VK, Instagram, TikTok і інш.) ад імя герояў твора ці пісьменніка, QR-коды, адукацыйныя Web-квэсты (webquests), буктрэйлеры (англ. booktrailers), online-анатацыі, сэлфі і інш.

## Тэма 8. Методыка правядзення нетрадыцыйных урокаў літаратуры

Прычыны ўзнікнення нетрадыцыйных урокаў літаратуры: тэорыя і гісторыя пытання. Нетрадыцыйныя ўрокі літаратуры і іх віды (паглыбленне паняцця).

Найбольш эфектыўныя тыпы нетрадыцыйных урокаў на II ступені літаратурнай адукацыі, методыка іх арганізацыі і правядзення. Асноўныя тыпы нетрадыцыйных урокаў на III ступені літаратурнай адукацыі.

Тыпалогія нетрадыцыйных урокаў кантролю і ацэнкі ведаў па літаратуры, методыка іх правядзення.

Настаўнікі-наватары (М. Жуковіч, В. Бухавец, М. Верціхоўская, Д. Крывашэй і інш.) і іх вопыт у правядзенні нетрадыцыйных урокаў.

## Тэма 9. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на асноўных этапах ўрока літаратуры

Выкарыстанне тэхналогіі праектнага навучання на этапе праверкі дамашняга задання па літаратуры. Падрыхтоўка даследчых, творчых і інфармацыйных праектаў як эфектыўны сродак праверкі дамашняга задання па літаратуры. Дыферэнцыраваны падыход пры вызначэнні тэматыкі праектаў. Методыка вызначэння тэм і мэт праектаў.

Асаблівасці прэзентацыі праектаў вучнямі на этапе праверкі дамашняга задання (максімальная інфарматыўнасць, часавая абмежаванасць, спалучэнне індывідуальнага і групавога відаў дзейнасці і інш.). Структура і афармленне пашпарта праектнай працы і партфоліо. Крытэрыі ацэнкі праектаў па літаратуры.

Прымяненне тэхналогіі перспектыўных ліній пры вывучэнні новага матэрыялу ў V – IX класах. Методыка вылучэння скразных ліній у праграме па беларускай літаратуры для V – IX класаў. Тыпалогія скразных тэм па літаратуры: гісторыя літаратуры (вывучэнне твораў/творчасці класікаў), тэорыя літаратуры (літаратурныя тропы, тэорыя вершаскладання), развіццё маўлення (эцюд – эсэ – сачыненне – водзыў – рэцэнзія).

Методыка падрыхтоўкі інфармацыйных апор, іх змястоўнае напаўненне. Структура інфармацыйнай карткі. Спалучэнне карткі-апоры і дадатковага матэрыялу (сачыненні, ілюстрацыі, творчыя работы).

Методыка выкарыстання элементаў педагагічных майстэрняў на этапе вывучэння новага матэрыялу ў X – XI класах. Выкарыстанне асноўных этапаў майстэрні (індукцыя, самаканструкцыя, сацыяканструкцыя, сацыялізацыя, разрыў, рэфлексія, панэль, слова майстра, творчасць) пры вывучэнні мастацкага твора, тэарэтыка-літаратурных паняццяў і звестак па гісторыі літаратуры на III ступені літаратурнай адукацыі.

Методыка вызначэння і вербальнай фармулёўкі праблемнага пытання і задання для правядзення работы па тэхналогіі. Праблемы ў ажыццяўленні работы па педагагічных майстэрнях і методыка іх вырашэння.

Выкарыстанне элементаў тэхналогіі развіцця крытычнага пры замацаванні вывучанага матэрыялу. Агульнае і адметнае пра выкарыстанні асноўных стадый тэхналогіі (выклік, актуалізацыя ведаў, асэнсаванне, рэфлексія) пры замацаванні ведаў па гісторыі і тэорыі літаратуры ў V – VIII і IX – XI класах. Методыка ажыццяўлення прыёмаў тэхналогіі: праўдзівыя і непраўдзівыя сцвярджэнні, дыяграма Вена, выклік па ключавых словах, «думай – дзяліся на пары – дзяліся думкамі», кластэр, напісанне творчых работ (эсэ, тэлеграм, інтэрв’ю), сінквейн, канцэптуальная табліца.

Методыка прымянення элементаў модульнай тэхналогіі на этапе кантролю і ацэнкі ведаў вучняў. Рэйтынгавая ацэнка паспяховасці дзейнасці вучняў на ўроку літаратуры. Віды ўзроўняў ведаў вучняў: ніжэйшы (падзейны), павярхоўна-ацэначны (пазнавальны), сярэдні – анэстэтычны (безуважны да глыбокага бачання мастацкіх сродкаў), высокі ўзровень (асэнсаваны), вышэйшы ўзровень (асэнсавана-аналітычны), спецыфіка кожнага з іх.

Методыка распрацоўкі рознаўзроўневых заданняў па літаратуры. Вопыт сучасных настаўнікаў і метадыстаў пры распрацоўцы заданняў і пытанняў пяці ўзроўняў складанасці (П. Лявонава, І. Булаўкіна, Т. Мароз і інш.).

Тэхналагічная карта вывучэння модуля, яе структура і методыка напісання.

### Тэма 10. Фарміраванне і развіццё чытацкіх і літаратурна-творчых здольнасцей вучняў на ўроку літаратуры

Вучні як чытачы. Сучасная педагагічная, псіхалагічная і метадычная навукі аб чытацкай дзейнасці. Праблема крытэрыяў літаратурнага развіцця ў псіхалогіі і методыцы выкладання літаратуры.

Псіхалагічны фактар і яго ўлік у працэсе знаёмства настаўніка з вучнёўскім успрыманнем твораў. Спецыфіка мастацкага ўспрымання і яго ўзроставая дынаміка. Узаемасувязь эмпірычнага ўспрымання, першаснага пазнання і аналізу мастацкага

твора. Мэты і задачы вывучэння чытацкага ўспрымання мастацкага твора вучнямі. Спосабы вывучэння чытацкага ўспрымання.

Чытацкія ўменні, навыкі і здольнасці, іх сутнасць, спецыфіка. Узаемасувязь чытацкіх (перцэптыўных) і літаратурна-творчых (пісьменніцкіх) уменняў. Спосабы выяўлення і методыка развіцця чытацкіх і літаратурна-творчых здольнасцей і ўменняў школьнікаў: мэтанакіраванае назіранне, метад зрэзаў, стылістычны эксперымент, творчыя працы (сачыненні, рэцэнзіі, водгукі, эсэ) і інш.

## Тэма 11. Методыка напісання анатацый, эцюдаў, эсэ, водгукаў і рэцэнзій па літаратуры

Праблема развіцця маўлення вучняў на сучасным этапе. Новыя падыходы да развіцця маўлення вучняў: псіхалінгвістычны, лінгвадыдактычны і методыка-літаратурны. Сутнасць псіхалінгвістычнага паняцця «маўленчая дзейнасць».

Мастацкі тэкст. Прэцэдэнтны тэкст, яго спецыфіка і магчымасці выкарыстання.

Анатацыя як жанр пісьмовых работ. Структура анатацыі да твора і кнігі, патрабаванні да яе. Алгарытм напісання анатацыі. Тыповыя недахопы анатацый.

Эцюд як літаратурны жанр, яго спецыфіка. Методыка напісання эцюдаў па праграмных творах і на вольныя тэмы.

Эсэ як мастацка-публіцыстычны жанр, патрабаванні да яго. Асаблівасці мастацкай выразнасці і функцыянальнасці эсэ. Прадмет, адрасант і адрасат у эсэ. Віды эсэ па жанрава-стылістычнай форме. Патрабаванні і этапы працы над эсэ.

Водгук і рэцэнзія як ацэначна-аналітычныя жанры, спецыфіка кожнага з іх. Адрозненне водгуку і рэцэнзіі. Віды водгукаў. Віды рэцэнзій. Патрабаванні да водгуку па літаратуры, яго кампазіцыя і методыка напісання. Патрабаванні да рэцэнзіі, яе структура, этапы напісання.

## Тэма 12. Вучэбна-даследчая дзейнасць вучняў на ўроках літаратуры

Даследчая дзейнасць па літаратуры, яе этапы і спецыфіка ў школе. Асноўныя віды навукова-даследчых работ па літаратуры. Тэма, мэта, прадмет і аб’ект даследавання, методыка іх вызначэння і фармулёўкі. Збор інфармацыі па тэме даследавання. Структура навукова-даследчых работ па літаратуры. Афармленне навукова-даследчых работ.

Рэферат як від даследчай работы па літаратуры. Даклад як від літаратуразнаўчай дзейнасці. Патрабаванні, крытэрыі ацэнкі рэфератаў і дакладаў па літаратуры.

Методыка арганізацыі і правядзення навуковай і навукова-практычнай канферэнцый па літаратуры ў школе.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «АКТУАЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ» (дзённая форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Ссамастойная работа студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| | **V семестр** | | | | | | |
| | **АКТУАЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ** | **24** | **24** | **52** | | | |
| **1.** | **Уводзіны** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 1.1. | 1. Тэарэтычныя асновы курса.<br>2. «Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры» як дысцыпліна педагагічнага профілю, яе сувязь з іншымі навуковымі дысцыплінамі.<br>3. Прадмет, змест і структура курса. Асноўныя пытанні курса.<br>4. Асноўныя падыходы да навучання літаратуры: антрапалагічны, дзейсны, сістэмны, культуралагічны, асобасна арыентаваны і інш. | 2 | | 4 | Метадычныя дапаможнікі па беларускай літаратуры. | [1]<br>[2] | |
| 1.2. | 1. Значэнне практыкі школьнага выкладання для развіцця метадалогіі методыкі.<br>2. Асноўныя метады даследавання ў галіне методыкі выкладання літаратуры.<br>3. Актуальныя аспекты методыкі выкладання беларускай літаратуры. | | 2 | | Метадычныя дапаможнікі па беларускай літаратуры. | [1]<br>[2] | Падрыхтоўка рэфератаў. |
| **2.** | **Кампетэнтнасны падыход пры вывучэнні літаратуры** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 2.1. | 1. Культуралагічная адукацыйная прастора, яе змест і структура.<br>2. Культуралагічны патэнцыял адукацыйнага прадмета | 2 | | 4 | Нарматыўныя дакументы. | [1]<br>[2]<br>[9] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | «Беларуская літаратура».<br>4. Літаратура як сацыякультурны феномен.<br>5. Беларуская літаратура як сродак далучэння вучняў да духоўнага жыцця і культуры народа, эстэтычнага асваення свету. | | | | | | |
| 2.2. | 1. Фарміраванне культуралагічнай кампетэнцыі вучняў сродкамі мастацкай літаратуры.<br>2. Духоўна-маральная культура вучняў і яе фарміраванне на ўроку.<br>3. Фарміраванне грамадзянскай культуры вучняў у працэсе аналізу праграмных твораў па літаратуры.<br>4. Камунікатыўная культура і методыка яе развіцця на ўроках літаратуры.<br>5. Фарміраванне і развіццё эстэтычнай культуры як важны кампанент навучання беларускаму мастацтву слова.<br>6. Экалагічная культура і методыка яе фарміравання на ўроку літаратуры на II і III ступенях літаратурнай адукацыі. | | 2 | | Нарматыўныя дакументы. | [1]<br>[2]<br>[9] | Канспектаванне нарматыўных дакументаў. |
| **3.** | **Фарміраванне функцыянальнай граматнасці на ўроку літаратуры** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 3.1. | 1. Спецыфіка кампетэнтнаснага падыходу ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.<br>2. Пераасэнсаванне працэсу падрыхтоўкі вучняў.<br>3. Кампетэнтнасная мадэль падрыхтоўкі як выпрацоўка сістэмы кампетэнцый, неабходных для далейшай прафесійнай дзейнасці.<br>4. Структура кампетэнцый як цэласнасць мэтава-каштоўнаснага, кагнітыўна-зместавага, дзейнаснага і рэфлексійнага кампанентаў.<br>5. Склад кампетэнцый: веды, спосабы дзейнасці, вопыт творчай дзейнасці, вопыт каштоўнасных адносін да аб’ектаў рэчаіснасці. | 2 | | 4 | Камп’ютарная прэзентацыя № 1. | [1]<br>[2]<br>[9] | |
| 3.2. | 1. Спецыяльныя (прадметныя) кампетэнцыі па беларускай літаратуры як аснова для фарміравання асноўных відаў функцыянальнай граматнасці.<br>2. Маўленчая, камунікатыўная, культуралагічная і чытацкая граматнасць.<br>3. Чытацкая граматнасць як важнейшая разнавіднасць | | 2 | | Камп’ютарная прэзентацыя № 1. | [1]<br>[2]<br>[9] | Экспрэс-апытанне. Падрыхтоўка рэфератаў. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | функцыянальнай граматнасці і спектр яе кампетэнцый.<br>4. Актыўны, мэтанакіраваны і канструктыўны характар выкарыстання чытання ў розных сітуацыях і з рознымі мэтамі. | | | | | | |
| **4.** | **Стан методыкі выкладання беларускай літаратуры на сучасным этапе развіцця адукацыі** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 4.1. | 1. Метадычная думка ў 2000–2020-я гады.<br>2. Удасканаленне зместу і структуры літаратурнай адукацыі, перапрацоўка праграм па літаратуры на аснове асобасна арыентаванага падыходу.<br>3. Актывізацыя метадычнай думкі ў першай трэці XXI стагоддзя.<br>4. Удасканаленне вывучэння мастацкага твора з улікам яго жанравай спецыфікі, разнастайных шляхоў аналізу.<br>5. Пошукі новых метадаў і прыёмаў навучання слоўнаму мастацтву.<br>6. Сучасны стан методыкі выкладання беларускай літаратуры: абнаўленне метадалогіі, пошук адметных тэхналогій, выкарыстанне вопыту замежнай школы. | 2 | | 4 | Метадычныя і навуковыя часопісы. | [1]<br>[2]<br>[7]<br>[8]<br>[9] | |
| 4.2. | 1. Роля часопісаў «Роднае слова», «Беларуская мова і літаратура, «Веснік адукацыі» і інш. у актывізацыі беларускай метадычнай думкі.<br>2. Змест і структура «Вучэбнай праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. V—XI класы».<br>3. Новыя дапаможнікі па беларускай літаратуры, іх тыпы і структура. | | 2 | | Метадычныя і навуковыя часопісы. | [1]<br>[2]<br>[7]<br>[8]<br>[9] | Аналіз метадычных і навуковых часопісаў. |
| **5.** | **Прынцыпы, метады і прыёмы выкладання літаратуры ў сучаснай адукацыйнай прасторы** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 5.1. | 1. Трансфармацыя прынцыпаў, метадаў і прыёмаў выкладання літаратуры на сучасным этапе.<br>2. Прынцыпы антрапалізацыі адукацыі, педагагічнай кангеніяльнасці і свабоды ў развіцці асобы, успрымання вучэбнага прадмета з пазіцый асобасных патрэб, развіццёвага навучання. | 2 | | 4 | Вучэбна-метадычныя дапаможнікі па беларускай літаратуры. | [1]<br>[2]<br>[7]<br>[8]<br>[9] | |
| 5.2. | 1. Найбольш эфектыўныя метады і прыёмы вывучэння літаратуры ў сучаснай адукацыйнай прасторы, іх адметнасць і спецыфіка. | | 2 | | Вучэбна-метадычныя дапаможнікі па беларускай | [1]<br>[2]<br>[7] | Падрыхтоўка фрагментаў урокаў з |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Камбінаванне розных метадаў і прыёмаў у адукацыйнай прасторы. | | | | літаратуры. | [8] [9] | выкарыстаннем сучасных метадаў і прыёмаў. |
| **6.** | **Высокатэхналагічнае адукацыйнае асяроддзе ў літаратурным навучанні. Методыка прымянення інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў на ўроках літаратуры** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 6.1. | 1. Высокатэхналагічнае адукацыйнае асяроддзе: склад, структура, спецыфіка функцыянавання на сучасным этапе развіцця літаратурнай адукацыі.<br>2. Функцыянальныя магчымасці высокатэхналагічнага адукацыйнага асяроддзя для развіцця чытацкіх, камунікатыўных, літаратурна-творчых і даследчых уменняў і навыкаў вучняў.<br>3. Перспектывы развіцця высокатэхналагічнага адукацыйнага асяроддзя.<br>4. Каталог інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для V – XI класаў. | 2 | | 4 | ЭСН, ЭАР | [1] [2] [9] | |
| 6.2. | 1. Нацыянальныя адукацыйныя інтэрнэт-парталы, методыка іх выкарыстання пры правядзенні ўрокаў па беларускай літаратуры.<br>2. Методыка прымянення ЭСН.<br>3. Выкарыстанне магчымасцей віртуальных музеяў і сайтаў, прысвечаных беларускім пісьменнікам, на ўроках літаратуры.<br>4. Прымяненне на ўроку і ў пазаўрочнай дзейнасці электронных хрэстаматый, гукавых электронных выданняў, мастацкіх электронных выданняў, аўдыякніг і інш.<br>5. Прымяненне электронных выданняў як сродкаў рэалізацыі міжпрадметных сувязей пры вывучэнні беларускай літаратуры. | | 2 | | ЭСН, ЭАР | [1] [2] [9] | Правядзенне элементаў урокаў з выкарыстаннем ЭСН. Рэйтынгавая кантрольная работа № 1. |
| **7.** | **Інфармармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі на ўроку літаратуры** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 7.1. | 1. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі як сукупнасць метадаў, працэсаў і праграмна-тэхнічных сродкаў, інтэграваных з мэтай збору, апрацоўкі, захавання, распаўсюджвання, | **2** | | 4 | ІКТ | [1] [2] [9] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | адлюстравання і выкарыстання інфармацыі.<br>2. Асноўныя сродкі ІКТ, якія атрымалі распаўсюджванне ў сучаснай сістэме адукацыі: персанальны камп'ютар, тэлекамунікацыі, мультымедыя, мабільныя прылады. | | | | | | |
| 7.2. | 1. Прэзентацыі (Microsoft PowerPoint).<br>2. Online-дошкі (Padlet, Miro, Lucidspark і інш.).<br>3. Інтэрнэт-заняткі з дапамогай парталаў.<br>4. Вядзенне акаўнтаў у сацыяльных сетках (Twitter, VK, Instagram, TikTok і інш.) ад імя герояў твора ці пісьменніка.<br>5. QR-коды, адукацыйныя Web-квэсты (webquests), буктрэйлеры (англ. booktrailers), online-анатацыі, сэлфі і інш. | | 2 | | ІКТ | [1]<br>[2]<br>[9] | Правядзенне элементаў урокаў з выкарыстаннем ІКТ. |
| **8.** | **Методыка правядзення нетрадыцыйных урокаў літаратуры** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 8.1. | 1. Прычыны ўзнікнення нетрадыцыйных урокаў літаратуры: тэорыя і гісторыя пытання.<br>2. Нетрадыцыйныя ўрокі літаратуры і іх віды (паглыбленне паняцця).<br>3. Найбольш эфектыўныя тыпы нетрадыцыйных урокаў на II ступені літаратурнай адукацыі, методыка іх арганізацыі і правядзення.<br>4. Асноўныя тыпы нетрадыцыйных урокаў на III ступені літаратурнай адукацыі. | 2 | | 4 | Канспекты нетрадыцыйных урокаў па літаратуры. | [1]<br>[2]<br>[11] | |
| 8.2. | 1. Тыпалогія нетрадыцыйных урокаў кантролю і ацэнкі ведаў па літаратуры, методыка іх правядзення.<br>2. Настаўнікі-наватары (М. Жуковіч, В. Бухавец, М. Верціхоўская, Д. Крывашэй і інш.) і іх вопыт у правядзенні нетрадыцыйных урокаў. | | 2 | | Канспекты нетрадыцыйных урокаў па літаратуры. | [1]<br>[2]<br>[11] | Правядзенне элементаў нетрадыцыйных урокаў. |
| **9.** | **Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на асноўных этапах ўрока літаратуры** | **2** | **2** | **4** | | | |
